ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
25
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 15 (1465)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## ТЭЛЕТАЙП

«ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### АДЗІНЫ ПАЛІТДЗЕНЬ

на тэму «Слава подзвігу, слава героям!» прайшоў ва універсітэце. На ім з прамовай выступіў сакратар Мінскага гаркома партыі П. К. Краўчанка.

У час правядзення адзінага палітдня на ўсіх факультэтах і ў падраздзяленнях перад студэнтамі і супрацоўнікамі выступілі ветэраны вайны, Героі Савецкага Саюза.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### НАРАДА-СЕМІНАР

са старшынямі саветаў прававога выхавання і прафілактыкі правапарушэнняў структурных падраздзяленняў універсітэта абмеркавала стан і меры па паляпшэнню прафілактыкі правапарушэнняў у калектывах БДУ. З асноўным дакладам выступіў старшыня універсітэцкага савета В. Г. Ціхіня.

Прафесар А. В. Дулаў у сваім выступленні звярнуў увагу на неабходнасць ліквідацыі недахопаў у рабоце па папярэджанню правапарушэнняў сярод студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ.

Н. РАЗУВАЕВА,
старшы юрысконсульт універсітэта.

### ДЗЕНЬ АДКРЫТЫХ ДЗВЯРЭЙ

для жадаючых паступіць вучыцца ва універсітэт на дзённую, завочную і вячэрнюю формы навучання па ўсіх спецыяльнасцях прайшоў у БДУ імя У. І. Леніна. У праграме — сустрэча выпускнікоў школ і вучылішчаў, рабочай і сельскай моладзі з членамі прыёмнай камісіі, прадстаўнікамі рэктарата, дэканамі факультэтаў; наведванне лабараторый, кабінетаў, вылічальнага цэнтра, музея гісторыі універсітэта. Будучыя абітурыенты пазнаёміліся з правіламі прыёму ў БДУ. У канцы быў прадэманстраваны кінафільм «Універсітэт запрашае на вучобу».

З. АЛЯШКЕВІЧ.

### НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ

канферэнцыя «Удасканаленне форм і метадаў героіка-патрыятычнага выхавання навучэнцаў», прысвечаная 40-годдзю Вялікай Перамогі, прайшла на факультэце павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

М. ДРОЗД,
дэкан ФПК.

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ



*ПРАЙШЛА 42-я студэнцкая навуковая канферэнцыя. Сотні студэнтаў з розных факультэтаў выступілі на ёй з дакладамі і паведамленнямі. Дзесяткі юнакоў і дзяўчат БДУ паехалі ва універсітэты саюзных рэспублік, каб падзяліцца вопытам студэнцкай навуковай работы.*

*Добра арганізавана і праведзена студэнцкая навуковая канферэнцыя на факультэце журналістыкі. Са змястоўным дакладам «Пісаць гісторыю сучаснасці. У. І. Ленін аб задачах публіцыстыкі і публіцыстаў (да 115-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна)» выступіла студэнтка 4-га курса Святлана Вяроха (на здымку). З дакладамі выступілі госці з Масквы, Ленінграда, Казані. Вольга Лабутава, студэнтка 5-га курса Казанскага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Ульянава-Леніна, у сваёй навуковай рабоце «Крытыка рэакцыйнай сутнасці буржуазных сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды ЗША» прывяла цікавыя прыклады адкрытай фальсіфікацыі гісторыі і сучаснасці буржуазнай прэсай.*

*А. ВАЛОШЫН.*
*Фота аўтара.*



**Пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі — наперад, да новых перамог у камуністычным будаўніцтве!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС).*

## САЛЮТ, ФЕСТЫВАЛЬ!

# ДЗЕЛЯ МІРУ І ДРУЖБЫ

**11 МАЯ 1984 ГОДА. НА СТАДЫЕНЕ УНІВЕРСІТЭТА САБРАЛІСЯ на мітынг савецкія і замежныя студэнты. Яны выказалі сваю гарачую падтрымку рашэнняў Гаванскага і Сафійскага пасяджэнняў Міжнароднага падрыхтоўчага камітэта да XII Сусветнага фестывалю аб правядзенні форума моладзі летам 1985 года ў Маскве...**

**15 жніўня. Студэнцкі будаўнічы атрад «Рытм» юрыдычнага факультэта ў дзень ударнай працы працаваў па-ударнаму — зарабіў 465 рублёў. Усе гэтыя грошы пералічаны ў фонд фестывалю. Дарэчы, за летні працоўны семестр і сельгасработы студэнты універсітэта пералічылі ў фонд фестывалю каля 30 тысяч рублёў...**

**17 кастрычніка. Мітынг-канцэрт, прысвечаны Міжнароднаму дню студэнтаў і XII Сусветнаму фестывалю. Паўтары тысячы савецкіх і замежных студэнтаў, яго удзельнікаў, былі аднадушнымі ў сваёй нянавісці да вайны, агрэсіі. Як пацвярджэнне гэтаму прагучала зачытаная ў адзін голас усімі ўдзельнікамі рэзалюцыя мітынгу-канцэрта...**

ТАК СТУДЭНЦТВА універсітэта пачало падрыхтоўку да XII Сусветнага фестывалю.

Калі стаў вядомы час правядзення фестывалю, камітэт камсамола склаў план работы, пры ідэалагічным аддзеле была створана лектарская група па гісторыі фестывальнага руху, якая кантралюе і дапамагае факультэцкім лектарскім групам. Бюро камітэта камсамола выконвае ролю штаба па падрыхтоўцы да фестывалю. На базе ленінскіх пакояў і пакояў інтэрнацыянальнай дружбы адкрыліся фестывальныя клубы ў інтэрнатах.

На факультэце журналістыкі дзейнічае клуб «Планета». Расказы аб сваіх краінах, гутаркі аб праблемах міжнароднага руху на розных кантынентах прадстаўнікоў 44 краін свету, якія вучацца на факультэце, сталі традыцыяй. А нядаўна сустрэча з членам Камітэта савецкіх жанчын, галоўным рэдактарам часопіса «Работніца і сялянка» М. І. Карпенка прайшла жыва, цікава.

Пачаў работу фестывальны клуб і на гістарычным факультэце. Тут праведзена сустрэча з дэлегатам XI Сусветнага фестывалю Альварада Мігелем, студэнтам з Коста-Рыка. У клубе ёсць свая лектарская група, якая распрацавала два цыклы лекцый «Аб гісторыі фестывальнага руху» і «Моладзь краін, што развіваюцца, у барацьбе за незалежнасць». Тут чытаюцца лекцыі па гісторыі фестывалю, праводзяцца вікторыны. Клуб выпускае сваю насценную газету. У фестывальным клубе актыўна працуюць савецкія і замежныя студэнты. Дарэчы, у перыяд падрыхтоўкі да фестывалю значна палепшылася супрацоўніцтва камітэта камсамола факультэта з землячтвамі. Шмат праведзена сумесных мерапрыемстваў, нямала яшчэ будзе. Так, на чарговую сустрэчу з клубам інтэрнацыянальнай дружбы ў школу-інтэрнат № 5 г. Мінска прыйшлі савецкія і чэхаславацкія студэнты. Гаварылі, вядома, не толькі пра фестываль, але і пра Чэхаславакію, пра жыццё дзяцей у іншых краінах. Усім было цікава. А Яна Маронгава, студэнтка 4-га курса аддзялення філасофіі, дала адрас школы-інтэрната невялічкага чэхаславацкага гарадка. Прайшло зусім нямнога часу, і паміж школьнікамі завязалася перапіска. Так нарадзілася дружба.

Некалькі слоў патрэбна сказаць аб рабоце дыскусійнага клуба «Палітыкус». На свае пасяджэнні ён збірае прадстаўнікоў самых розных краін. Клуб існуе восем гадоў. Ен мае сваю гісторыю, свае традыцыі. «Палітыкус» стане секцыяй гарадскога фестывальнага клуба на базе студэнцкага кафэ «Гаўдэамус». У праграме клуба — сустрэчы з цікавымі людзьмі, удзельнікамі мінулых фестываляў, прыём замежных дэлегацый. Формы работы самыя розныя: сустрэчы за «круглым сталом», гутаркі па гісторыі маладзёжнага руху, канцэрты. 15 землячтваў замежных студэнтаў рыхтуюць праграмы сваіх выступленняў у гарадскім фестывальным клубе.

У рабоце клубаў, пры падрыхтоўцы ўсіх фестывальных мерапрыемстваў асаблівае значэнне мы надаём антываеннай тэме, прапагандзе маладзёжнага руху. «За антыімперыялістычную салідарнасць, мір і дружбу!» — гэта не толькі дэвіз фестывалю. Мір — галоўнае для кожнага чалавека і чалавецтва ў цэлым. І паняцці «форум моладзі», «маладзёжны рух», «барацьба за мір» для нас непадзельныя. Гэта асноўная думка кожнай сустрэчы, кожнага пасяджэння, кожнага канцэрта, прысвечаных XII Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

В. ШАДУРСКІ,
намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па інтэрнацыянальнаму выхаванню.

ТВАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА

# У ЗАЛІКА ВЯЛІКІ ЛІК

**Тры гады назад у БДУ імя У. І. Леніна ўпершыню сярод ВНУ рэспублікі ў парадку эксперыменту прайшоў палітзалік. Ён садзейнічаў павышэнню ўзроўню палітычных ведаў студэнтаў, дапамог больш глыбокаму і паслядоўнаму выкананню асабістага комплекснага плана. З'яўляючыся формай сумеснай дзейнасці камсамольскіх арганізацый і кафедраў грамадскіх навук, ён стаў асновай пры падвядзенні вынікаў грамадска-палітычнай атэстацыі студэнтаў. Папярэднія вынікі паказалі, што справа гэта важная і неабходная.**

У ХОДЗЕ правядзення палітзаліку партыйная і камсамольская арганізацыі універсітэта больш за ўсё імкнуліся індывідуальна і дыферэнцыравана падыходзіць да вызначэння палітычнага ўзроўню ведаў кожнага студэнта, яго ўменне прымяніць атрыманыя веды пры ацэнцы важнейшых палітычных падзей.

Не адразу ўсё атрымлівалася. Першы год студэнтам прапаноўваўся прыкладны пералік пытанняў, па якіх яны рыхтавалі паведамленні і выступалі ў групах. Часам праводзіліся палітычныя дыскусіі, палітбаі. Але гэта нас не заўсёды задавальняла. Значная частка студэнтаў была пасіўнай, таму ў наступным годзе працягваўся пошук больш дзейсных метадаў, больш актыўных форм правядзення палітзаліку. Гэта дало свае вынікі.

Што ж ўяўляе палітзалік зараз?

У гэтым годзе ён прайшоў напярэдадні 115-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна. Форма правядзення — індывідуальная гутарка членаў камісіі з кожным студэнтам. У камісію, як правіла, уваходзяць выкладчыкі грамадскіх навук, куратары акадэмічных груп, прадстаўнікі факультэцкіх партыйных арганізацый, камітэтаў камсамола і камсоргі. Кожны атэстуемы атрымаў білет з трыма пытаннямі з праграмы палітзаліку. Члены камісіі, а таксама студэнты групы маюць права задаваць пытанні. Ад здаючага патрабуюцца не толькі глыбокія веды асноўных палажэнняў марксісцка-ленінскай тэорыі, але і ўменне выкарыстоўваць гэтыя веды на практыцы. Па выніках гутаркі камісія выстаўляла адзнакі: «выдатна», «добра», «здавальняюча», «не залічана». Вынікі здачы палітзаліку з'яўляюцца асновай пры атэстацыі па ГПП.

Найбольш важны і адказны этап пры падрыхтоўцы да палітзаліку — складанне праграмы, падрыхтоўка пытанняў. Яны павінны быць арыгінальнымі, прымушаць студэнта не проста шукаць адказ у тым ці іншым даведніку, а думаць, аналізаваць самастойна. Адзін з этапаў падрыхтоўкі да палітзаліку — шматлікія факультэцкія і курсавыя кансультацыі з удзелам выкладчыкаў грамадскіх навук і членаў лектарскіх груп. Наколькі сур'ёзнымі і складанымі з'явіліся пытанні палітзаліку, сведчыць факт. За два тыдні да яго правядзення ў бібліятэцы БДУ была арганізавана выстаўка літаратуры па вызначанай тэматыцы. Бібліятэку за кароткі час наведала столькі студэнтаў, што яе супрацоўнікі ледзь паспявалі абслугоўваць чытачоў.

Падвядзём вынікі. За час правядзення палітзаліку ў ім прынялі ўдзел 6083 студэнты 1—4 курсаў, з іх 53 працэнты атрымалі выдатныя адзнакі, 38,1 — добрыя, 4,4 — здавальняючыя. 4,5 працэнта студэнтаў не змаглі здаць ці не з'явіліся на залік. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што большасць студэнтаў добра арыентуюцца ва ўнутранай і знешняй палітыцы нашай дзяржавы, гісторыі маладзёжнага руху.

Разам з тым, нас хвалюе вялікі працэнт студэнтаў, якія атрымалі адзнакі «нездавальняюча» або «не залічана». Іх па універсітэту — 538 чалавек. Гэта, як правіла, студэнты, якія недастаткова глыбока разбіраюцца ў пытаннях праграмы, што прымушае прымаць больш канкрэтныя меры па ўдасканаленню палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў.

А як самі студэнты адносяцца да палітзаліку? Намі было праведзена анкетаванне камсамольскага актыву, у якім задаваліся два пытанні: «Вашы адносіны да палітзаліку?» і «Якія недахопы ў арганізацыі палітзаліку вы б адзначылі?» Усе без выключэння адзначылі важнасць правядзення палітзаліку. Большасць лічаць цяперашнюю форму яго правядзення найбольш эфектыўнай. З недахопаў у правядзенні ўсімі адзначаўся адзін, напэўна, самы важны: адсутнасць дакладных крытэрыяў выстаўлення ацэнак.

Патрэбна адзначыць, што тут многае залежыць ад саставу камісіі, ад патрабавальнасці, у першую чаргу, выкладчыкаў грамадскіх навук. А яе часам не хапае. Інакш чым можна растлумачыць, напрыклад, што студэнты 1-й і 4-й груп I курса, а таксама 1-й групы III курса юрыдычнага факультэта атрымалі толькі выдатныя адзнакі? Ці не паспяшаліся члены камісіі, выстаўляючы вышэйшы бал? Ці не ператварыўся палітзалік у фармальнасць? Сабраліся, выставілі ацэнкі для справаздачы, так, каб не было пакрыўджаных. Не пашкадавалі выдатных і добрых адзнак і камісіі, якія працавалі на біялагічным факультэце — усяго 93 працэнты. Не вельмі прытрымліваліся тут асноўнага правіла: нам патрэбны выдатныя адзнакі, якія б адлюстроўвалі выдатныя веды. Прыкладам патрабавальных і прынцыповых адносін да справы могуць служыць камісіі, якія працавалі на факультэце журналістыкі. Імі было выстаўлена 28,4 працэнта выдатных адзнак, 46,3 — добрых, 11,7 — здавальняючых.

Вынікі палітзаліку разглядаліся на пасяджэнні бюро камітэта камсамола універсітэта. Была падкрэслена вялікая роля універсітэцкага савета па ГПП студэнтаў, які ажыццяўляе арганізацыйнае і метадычнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем палітзаліку. Актыўна працавалі члены саветаў па ГПП факультэта радыёфізікі і электронікі, біяфака і іншых. Вялікую работу правялі выкладчыкі кафедраў грамадскіх навук. Актыўна ўдзельнічалі ў правядзенні палітзаліку дацэнты М. Г. Елісееў, М. А. Ярмаліцкі, выкладчыкі К. М. Кунцэвіч, М. В. Жаўно і іншыя. Але асноўная роля выпала на долю камітэтаў камсамола факультэтаў і камсоргаў. Можна адзначыць станоўчую работу такіх камсамольцаў, як Т. Рутлоўская, І. Грамыка, С. Яскевіч, А. Ціхалашвілі. Разам з тым на бюро камітэта камсамола былі абмеркаваны і вызначаны асноўныя меры па ўдасканаленню форм і метадаў правядзення палітзаліку.

Мы далёкія ад таго, каб лічыць палітзалік сродкам вырашэння ўсіх праблем у сферы палітычнага выхавання студэнтаў. Разам з тым, вопыт паказвае, што палітзалік з'яўляецца арганічнай часткай грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў, яе асновай. Думаецца, што знойдзена найбольш удалая і эфектыўная форма кантролю за станам ідэалагічнай работы ў камсамольскіх арганізацыях універсітэта.

**Ю. ЮШКО,**
**выкладчык кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў, адказны за сектар ГПП і Ленінскага заліку камітэта камсамола універсітэта.**

АКТЫВІСТЫ СНТ

# І АБАВЯЗКОВА — ЗАХОПЛЕНАСЦЬ

**Святлана Гогаль — студэнтка другога курса факультэта журналістыкі, лаўрэат рэспубліканскага конкурсу студэнцкіх навуковых работ. Я папрасіў яе расказаць аб сваёй навуковай працы.**

— Святлана, што, на твой погляд, найбольш патрэбна студэнту-даследчыку?

— Лічу, што абавязковая ўмова поспеху — захопленасць. Са школьных гадоў цікавілася паэзіяй Рыгора Барадуліна. Натуральна, што і першую сваю работу прысвяціла іменна яго творчасці. Паспрабавала выказаць у ёй свае назіранні, па-новаму асэнсаваць прачытанае. Потым выступіла з дакладам на факультэцкай навуковай канферэнцыі, дзе ён быў прызнаны адным з лепшых. І ўсё ж хацелася больш глыбока заняцца гэтай тэмай. Мой кіраўнік, старшы выкладчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Мікола Рыгоравіч Каваленка, падтрымаў маё жаданне паглыбіць даследаванне. І было прыемна даведацца, што работа адзначана дыпломам рэспубліканскага савета па НДРС. Неабходна сказаць, што зараз многія мае аднакурснікі, члены гуртка стылістыкі, таксама рыхтуюць даклады, каб выступіць на традыцыйнай студэнцкай навуковай канферэнцыі, якая пройдзе ў красавіку.

— Дапытлівасць і зацікаўленасць. Гэтыя рысы, напэўна, галоўныя ва ўсіх справах гуртkоўцаў?

— Так, мы імкнёмся зрабіць кожнае мерапрыемства цікавым, змястоўным. Нікога не пакінулі абыякавымі сустрэча гуртkоўцаў з Янкам Брылём, сумесныя пасяджэнні з літаратурным аб'яднаннем «Рунь». Даўняя дружба звязвае нас і са студэнтамі філфака. Гурток стылістыкі лічыцца адным з лепшых на факультэце. У гэтым ёсць і заслуга яго кіраўніка М. Р. Каваленкі — добрага знаўцы роднага слова, які ўмее прывіць студэнтам любоў да яго.

**Святлана — староста гуртка стылістыкі. Зразумела, няпроста дзяўчыне спалучаць абавязкі старасты, грамадскую работу і добрую вучобу. Але студэнтка спраўляецца. Яна ўпэўнена, што калі правільна размеркаваць свой час, то можна паспець зрабіць многае.**

**Гутарку правёў**
**І. ЗЫБАЙЛА,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

ЛЕНІНСКІ КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК



*ПРАЙШОЎ камуністычны суботнік. Кожны дзень групы студэнтаў накіроўваліся ў розныя кропкі Мінска.*

*Першую і другую групы I курса геаграфічнага факультэта мы сустрэлі ў Фрунзенскім раёне горада на праспекце Дзяржынскага.*

*НА ЗДЫМКАХ: «Усе на суботнік!»; кіпіць работа; Эла Волкава, студэнтка 1-га курса геафака.*

*Фота А. ВАЛОШЫНА.*





ПАЗЫЎНЫЯ ТРЭЦЯГА ПРАЦОЎНАГА

# «ЧАРАЎНІЦЫ» КУЮЦЬ ХАРАКТАР

**ЗУСІМ НЯДАЎНА, здаецца, пачаўся другі семестр. Але час ідзе незаўважна, набліжаецца сесія. Сесія — заўсёды важны перыяд у жыцці студэнта. Аднак не толькі падрыхтоўкай да яе заняты мы зараз. Нельга забываць пра тое, што на змену другому семестру прыходзіць трэці — працоўны.**

ПАДРЫХТОЎКА да працоўнага семестра — справа адказная, тым больш для тых будаўнічых атрадаў, якія фарміруюцца ўпершыню. Такім з'яўляецца і СБА «Чараўніцы» факультэта прыкладной матэматыкі. І хоць байцы атрада — людзі вопытныя і ў асноўным усе прайшлі школу СБА, аднак узнікаюць цяжкасці ў тым плане, што яны ўпершыню будуць працаваць і жыць разам. Таму на кіраўніцтва атрада кладзецца адказная і важная задача — стварэнне дружнага, згуртаванага калектыву. Вырашэнню гэтай задачы і падпарадкавана сумесная работа ў час падрыхтоўчага перыяду.

Дзейнасць атрада носіць рознабаковы характар: правядзяцца суботнікі ў інтэрнаце № 6, актыўна рыхтуецца да выступлення лектарская група атрада. Яна прачытае лекцыі аб нашым універсітэце, аб міжнародным фестывальным маладзёжным руху, лекцыі па актуальных праблемах сучаснай знешняй і ўнутранай палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы.

Цікавы рэпертуар прапануе гледачам агітбрыгада. Ён прысвечаны святкаванню 40-годдзя Вялікай Перамогі.

І ўсё ж галоўнай, калі можна так сказаць — ударнай справай у падрыхтоўчы перыяд з'явілася для атрада шэфства над дзіцячым домам № 2 Мінска. Па некалькі разоў на тыдзень прыходзяць байцы атрада на дапамогу выхавацелям і педагогам. І лепшай узнагародай для іх з'яўляецца радасць на тварах дзяцей, з якімі яны шчодра дзеляцца цеплынёй сваіх сэрцаў.

Вялікая работа праводзіцца і з уключанымі ў састаў СБА «цяжкімі» падлеткамі. Мы імкнёмся арганізаваць справу так, каб яны прымалі самы актыўны ўдзел ва ўсёй рабоце атрада. Яны ўваходзяць у састаў агітбрыгады, удзельнічаюць у афармленні нагляднай агітацыі. І не такім ужо цяжкім становіцца іх характар, калі падысці да дзяцей шчыра і з душэўнай цеплынёй.

І мы ўпэўнены, што ў трэцім працоўным семестры кожны баец «Чараўніц» праявіць працавітасць, напорыстасць, перакананасць — якасці, якімі валодае ганаровы баец атрада Мікалай Астроўскі.

**І. САКАЛОВА,**
**камандзір СБА «Чараўніцы».**



*ПЛЕННЫ ўклад у падрыхтоўку кадраў вышэйшай кваліфікацыі ўносіць загадчык кафедры метадаў аптымальнага кіравання, заслужаны дзеяч навукі БССР Р. Ф. Габасаў.*

*НА ЗДЫМКУ: прафесар Р. Ф. Габасаў праводзіць кансультацыю з аспіранткай.*

*Фота П. НАВАТАРАВА.*

СТУДЭНТ І НАВУКА

# АТРАД ДАСЛЕДЧЫКАЎ

УЖО ТРЭЦІ год на ФПМ працуе студэнцкі навуковы атрад (СНА). Ён адрозніваецца ад астатніх атрадаў тым, што байцы яго працуюць круглы год і займаюцца работай па сваёй будучай спецыяльнасці.

На працягу семестра байцы гэтага атрада рыхтуюць навуковыя даклады, знаёмяцца з асноўнымі праблемамі сучаснай вылічальнай тэхнікі.

У гэтым годзе студэнтамі распрацавана праграма, якая вызначае аптымальныя ўмовы работы сістэм масавага абслугоўвання. Летам студэнты навуковага атрада працуюць у інстытутах і вылічальных цэнтрах Мінска. У мінулым годзе ў Вылічальным цэнтры калектыўнага карыстання МінВНУ БССР яны працавалі аператарамі ЭВМ і вылічальных машын III катэгорыі, ва Усесаюзным дзяржаўным праектнатэхналагічным інстытуце механізацыі ўліку і вылічальных работ — інжынерамі. Імі было складзена некалькі праграм у галіне медыцынскай дыягностыкі. Акрамя таго, байцы атрада прымалі ўдзел ва ўкараненні праекта механізацыі бугалтарскага ўліку. Студэнтамі, якія працавалі ў гэтым інстытуце, за два месяцы асвоена 2 100 рублёў.

Байцамі нашага навуковага атрада з'яўляюцца студэнты 2—4 курсаў, прычым трэця- і чацвёртакурснікі складаюць праграмы, а другакурснікі рыхтуюцца да гэтага.

Як і ў любой новай справе, у нас таксама шмат цяжкасцей. Нам, байцам атрада, хацелася б працаваць у адным месцы, а не ў розных установах. На жаль, такога нам пакуль што заказчык забяспечыць не можа. Але спадзяёмся, што ў хуткім часе гэтыя і іншыя пытанні будуць вырашаны. У гэтым нам дапамагае навуковы кіраўнік атрада — асістэнт кафедры агульнага праграміравання П. П. Кожыч.

**А. СКУРКО,**
**камандзір СНА;**
**Г. ПОЗНЯК,**
**камісар СНА.**

ВАЧЫМА ЗАМЕЖНАГА СТУДЭНТА

# «Я палюбіў цябе, Белая Русь»

З ТАГО ЧАСУ, як прыехаў вучыцца ў Мінск, я марыў пабываць за межамі горада. Асабліва вабіла мяне беларуская вёска.

Чаму цікавіла мяне іменна вёска? Я лічу, што жыццё гарадоў розных краін свету мае агульныя рысы, а вёскі заўсёды адрозніваюцца.

І яшчэ. Я меў негатыўнае ўяўленне аб вёсцы. У мяне было шмат пытанняў, на якія я хацеў знайсці адказ.

У мінулым годзе паявілася магчымасць пабываць у беларускай вёсцы: мяне і майго сябра запрасіў да сябе ў госці студэнт журфака Леанід Чарапавіцкі.

Па дарозе ў вёску, дзе жыў Леанід, нас зачаравалі цудоўныя краявіды беларускай прыроды. Мы любаваліся ёю і не маглі налюбавацца. Адзін малюнак змяняўся другім, другі — трэцім. Гэта спрыяла добраму настрою.

Ужо ў дарозе я знайшоў адказы на многія пытанні. Пераканаўся ў ветлівасці, добразычлівасці і гасціннасці беларускіх людзей.

У Баранавічах наш аўтобус зрабіў чатыры кароткія прыпынкі. Скарыстаўшы гэта, мы з сябрам вырашылі пагуляць. І не заўважылі, як прайшоў час: спахапіліся, што спазніліся на аўтобус. Але які было наша здзіўленне, калі мы ўбачылі аўтобус на месцы. Ён чакаў нас. Нас чакалі людзі, якія знаходзіліся ў аўтобусе. А яны, магчыма, спяшаліся дамоў ці на работу.

Здавалася б, на першы погляд, што гэты выпадак не заслугоўвае ўвагі. Але ён запомніцца мне надоўга. У сувязі з гэтым успомнілася паездка ў Італію, дзе мы сутыкнуліся з вялікімі цяжкасцямі. Зараз, параўноўваючы гэтыя факты, я яшчэ раз пераканаўся ў непаўторнай дабраце і шчырасці беларусаў. А калі прыехалі ў вёску, то аўтобус спыніўся каля дома нашага сябра.

Так атрымалася, што калі мы прыехалі, то нас ніхто не сустрэў. У гэты час усе былі на рабоце, і мы спачатку падумалі, што давядзецца чакаць гаспадароў на вуліцы. Але і тут мы адчулі гасціннасць жыхароў вёскі. Нас, незнаёмых людзей, запрасіла да сябе ў дом чацвёртакласніца Таіса, дзе мы і дачакаліся гаспадароў.

У гэты ж дзень мы пабывалі ў клубе саўгаса «Нача», дзе праходзіў школьны вечар. У актавай зале, дзе сабраліся дзесецікласнікі, іх бацькі, рабочыя саўгаса, было шумна, весела. Усе танцавалі, гучалі песні, музыка. Стваралася ўражанне, што ўсе прысутныя — адна вялікая сям'я. І я зрабіў для сябе вывад, што так жыць людзі могуць толькі там, дзе не ўладарыць прыватная ўласнасць, дзе няма эксплуатацыі чалавека чалавекам.

Я пераканаўся, што жыхары вёсак не адстаюць ад гараджан і ў плане культурнага развіцця. У сельскім клубе паказваюць кінафільмы (савецкія і замежныя), у кожным доме ёсць радыё, над дахамі высяцца антэны тэлевізараў. А тое, што ў вёсцы ёсць яслі, магазін, дзіцячы сад, пошта, бальніца, абвяргае прапаганду заходніх ідэолагаў аб тым, што ў вёсках дрэннае сацыяльнае забеспячэнне.

Цудоўнымі і непаўторнымі былі дні, праведзеныя ў гэтай беларускай вёсцы. І мне раптам падумалася, што я ў сябе на радзіме, сярод сваіх людзей, таксама гасцінных і шчырых, працавітых і добразычлівых. Але каб гэтае ўяўленне не знікла, у Йемене шмат што патрэбна змяніць. І я веру, што ўбачу гэтыя добрыя змены.

**Абдуль-уахаб М. АЛЬ РАУХАНА,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

# Калі збываюцца мары

...СТРАШЭННЫ ВЯЛІЗНЫ танк хутка набліжаўся. Яфрэйтар Качатыгаў замёр на дне акопа, сціснуўшы ў руцэ бутэльку з запальнай сумессю. Машына ўсім цяжарам навалілася на акоп і пачала «прасаваць» яго. Развярнуўшыся, прайшла раз, другі, а калі ад'ехала, паранены яфрэйтар выбраўся з зямлі і, сабраўшы апошнія сілы, кінуў бутэльку. Танк загарэўся...

Гэтай невялікай, але цікавай роляй яфрэйтара Качатыгава ў фільме «Яны змагаліся за Радзіму» дэбютаваў у кіно 12 гадоў назад Андрэй Растоцкі. З таго часу ён зняўся ў 25 кінастужках. Гледачы добра ведаюць яго ролі: Аркадзь Голікаў («Канец імператара тайгі»), Дзяніс Давыдаў («Эскадрон гусар лятучых»), лейтэнант Клімаў («Праўда лейтэнанта Клімава»). Ён сыграў галоўныя ролі ў кінафільмах «Сярэбраныя азёры», «Непераможны», «Першая конная» і іншых.

Нядаўна Андрэй Растоцкі быў госцем універсітэта. Акцёр выступіў перад студэнтамі, расказаў пра сябе, адказаў на шматлікія пытанні.

**— Андрэй Станіслававіч, ці зрабіла прафесія бацькоў уплыў на Ваш выбар?**

— Так, калі мне споўнілася дзесяць гадоў, бацька ўпершыню ўзяў мяне ў кінаэкспедыцыю. Уражанні былі вельмі моцныя. Я трапіў у атмасферу творчасці, якая панавала на здымачнай пляцоўцы, зразумеў, наколькі складаная і ў той жа час цікавая праца акцёра.

**— Вы вельмі пераканаўча сыгралі ролю Дзяніса Давыдава ў фільме «Эскадрон гусар лятучых». Відаць, нялёгка было працаваць над ёю?**

— Яшчэ як нялёгка. Патрэбна было зразумець, адчуць, што гэта быў за чалавек, што ім кіравала. Шмат чытаў, як кажуць, уваходзіў у ролю. А яшчэ кожны дзень займаўся чыста тэхнічнай работай: фехтаваннем, верхавой яздой, танцамі, французскай моваю, вывучыся іграць на гітары.

**— Якія ролі Вам бліжэй: гістарычных герояў ці сучасных?**

— Вядома, сучасных, але цікавей працаваць над гістарычным матэрыялам.

**— Андрэй Станіслававіч, як Вы ставіцеся да амплуа станоўчага героя?**

— Я памятаю словы Станіслаўскага, які гаварыў, што ў адмоўным героі патрэбна шукаць станоўчыя рысы, а ў станоўчым — адмоўныя. Я лічу, што не бывае ідэальных людзей. І задача акцёра — паказаць не ідэал, а жывога чалавека.

**— І апошняе, традыцыйнае пытанне: якія новыя Вашы работы ў хуткім часе выйдуць на экран?**

— У карціне «Увага! Усім пастам...» я сыграў работніка міліцыі.

**Запісала В. ЖАРЫНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**




# ЯК СПРАВЫ, веласіпедысты?

ПА НАШЫМ уяўленні няма нічога прасцей, чым ездзіць на веласіпедзе: толькі націскай на педалі. Але людзі, па-сапраўднаму ўлюбёныя ў веласпорт, мяркуюць інакш. Давайце на некалькі хвілін зазірнём на трэніроўку зборнай універсітэта па веласпорту.

Пакой, дзе трэніруюцца спартсмены, гудзе, як пчаліны рой, юнакі і дзяўчаты круцяць педалі так, што-пры ўсім старанні нельга разгледзець спіцы на колах. Але... веласіпед стаіць на месцы. Справа ў тым, што ідуць заняткі на трэнажорах. Колы не дакранаюцца да падлогі, і спартсмены толькі імітуюць рух веласіпеда.

Членаў зборнай універсітэта добра ведаюць аматары веласіпеднага спорту Беларусі. Зараз у састаў каманды ўваходзяць бронзавыя прызёры чэмпіяната рэспублікі ў гонцы на 25 км Наталля Яраштчук (мехмат), Таццяна Трацщяк (журфак), Марына Цернавая (гістфак). Ва універсітэце быў падрыхтаваны чэмпіён БССР у групавой гонцы на 200 км Ігар Крэсік (юрфак). Каманда велагоншчыкаў вось ужо пяць гадоў запар займае другое месца на першынстве Белсавета ДСТ «Буравеснік». А ў мінулым годзе нашы дзяўчаты выступалі ў саставе зборнай БССР на Усесаюзных студэнцкіх гульнях, дзе былі пятымі.

Анатоль Уладзіміравіч паказвае інвентар секцыі. Ён не вельмі багаты.

— Зразумела, гэта нас не задавальняе,— гаворыць трэнер,— не хапае запчастак, патрэбна замяніць веласіпеды, а то спартсмены не паспяваюць іх рамантаваць. Ды і пакой велабазы стаў ужо цесным.

У пачатку кожнага новага навучальнага года праходзіць сход першакурснікаў. На ім студэнты выбіраюць спартыўныя секцыі, у якіх яны жадалі б займацца. На жаль, жадаючых займацца веласпортам мала. І нават з тых, хто прыходзіць сюды, не ўсе застаюцца. Трэнер часта наведвае спаборніцтвы па кросу, лёгкай атлетыцы. Тут ён знаходзіць студэнтаў, якія нядрэнна бегаюць стайерскія дыстанцыі, запрашае іх у секцыю. Большасць з іх не мае ўяўлення аб веласпорце. І ўсё пачынаецца з «нуля».

Але паступова навічкі становяцца майстрамі. Другакурсніцу журфака Т. Трацщяк Анатоль Сяргеевіч «знайшоў» у лёгкаатлетычнай секцыі. Пра веласпорт дзяўчына і не думала. А вясной мінулага года стала ўжо кандыдатам у майстры спорту.

Падрыхтоўка велагоншчыкаў да новага сезона завяршылася. Спартсмены ў саставе зборнай Белсавета «Буравеснік» выязджалі ў Брэсцкую вобласць. Тут яны прынялі ўдзел у спаборніцтвах на прыз Яўгена Мальца.

Настрой каманды выдатны. І ёсць усе падставы разлічваць на высокія вынікі ў спаборніцтвах гэтага сезона. А галоўнымі экзаменамі зборнай з'явяцца першынство Белсавета ДСТ «Буравеснік» і чэмпіянат БССР.

І. АДАМОВІЧ,
студэнт факультэта журналістыкі.

*ЗВЫШ ДЗВЮХ тысяч спартсменаў выйшлі на старт традыцыйнай лёгкаатлетычнай эстафеты па вуліцах Мінска, якую праводзіў БДУ імя У. І. Леніна. Эстафета была прысвечана 115-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна. На ўрачыстым адкрыцці спаборніцтваў выступілі сакратар партыйнага камітэта універсітэта М. І. Дзямчук, старшыня камітэта па фізкультуры і спорту пры Мінгарвыканкоме У. В. Бабіцкі.*

*У сваіх групах пераможцамі выйшлі СШ № 52, ТВ № 8, тэхнікум сувязі, КБТМ, СК «Трактар». Нашы спартсмены занялі другое месца, зусім нямнога ўступіўшы першай камандзе ІФК.*



НА ЗДЫМКУ: на дыстанцыі трэцякурсніца хімфака Ала Трахаўцова.
Фота А. ВАЛОШЫНА.

# Усесаюзны фізкультурны

**Больш за паўстагоддзя крочыць па краіне фізкультурны комплекс «Гатовы да працы і абароны СССР». У студзені гэтага года прынята новае палажэнне аб комплексе.**

УСЕСАЮЗНЫ фізкультурны комплекс складаецца зараз з дзвюх частак. Першая — «Будзь гатовы да працы і абароны СССР» — прызначана для школьнікаў 6 — 15 гадоў. Другая — «Гатовы да працы і абароны СССР» — для навучэнцаў і працоўных ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў. Комплекс ГПА уключае тры ступені: для насельніцтва ва ўзросце 16 — 17, 18 — 39 і 40 — 60 гадоў. Кожная ступень складаецца з чатырох раздзелаў: ведаў, навыкаў, патрабаванняў да рухомага рэжыму, відаў іспыту і норм.

Увядзенне новых патрабаванняў выклікае перабудову работы па падрыхтоўцы студэнтаў да здачы нарматываў комплексу ГПА. Ва універсітэце назапашаны багаты вопыт. Штогод выконваецца план падрыхтоўкі значкістаў ГПА і разраднікаў па мнагабор'ю ГПА. На сённяшні дзень 60 працэнтаў студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта выканалі нарматывы комплексу.

І гэта не выпадкова. Дэканаты, грамадскія арганізацыі, выкладчыкі фізвыхавання на факультэтах сур'ёзна адносяцца да справы. У той жа час трывожыць становішча, якое склалася на біялагічным, гістарычным факультэтах, дзе працэнт выканання не перавышае 35, філалагічным, геаграфічным, на якіх нарматывы выканалі менш за палавіну студэнтаў.

Штогод ва універсітэце праходзяць першынствы па летняму і зімоваму мнагабор'ю. Многія студэнты выконваюць спартыўныя разрады. Аналагічныя спаборніцтвы праводзяцца і на факультэтах. Зборныя універсітэта — пастаянныя прызёры чэмпіянатаў абласнога савета ДСТ «Буравеснік». Тым не менш яшчэ выкарыстоўваюцца не ўсе рэзервы.

Новыя патрабаванні комплексу ГПА закліканы павялічыць колькасць паспяхова здаўшых нарматывы, наладзіць работу па комплексу больш эфектыўна.

Звыш палавы першакурснікаў ва універсітэце не ўмеюць плаваць. Усіх іх давodзіцца вучыць плаванню на першым-другім курсах. Але ўсё ж не ўсе з іх могуць праплыць 50 метраў, каб здаць нарматыў. Бывае, да студэнтаў прад'яўляюцца нізкія патрабаванні, яны не наведваюць заняткі, пры гэтым упэўнены, што атрымаюць залік па фізвыхаванню.

Слаба наладжана здача нарматываў ГПА сярод супрацоўнікаў, не праводзяцца спаборніцтвы па мнагабор'ю ГПА.

Сустракаюцца і такія выпадкі, калі замест тварчай працы на факультэтах займаюцца прыпісканмі. Нам важна, каб студэнты на справе былі добра падрыхтаванымі фізічна, а не з'яўляліся «ліпавымі» значкістамі. Неэфектыўна яшчэ працуюць факультэцкія камісіі па комплексу ГПА.

У маі ва універсітэце праводзяцца дні комплексу ГПА, калі студэнты ўсёй групай ідуць здаваць нарматывы. Хацелася б, каб камітэты камсамола, спортбюро факультэтаў аднесліся да гэтага не фармальна і гэтыя дні вылілся ў сапраўднае спартыўнае свята.

Новыя патрабаванні Усесаюзнага фізкультурнага комплексу «Гатовы да працы і абароны» прадугледжваюць актыўныя заняткі фізкультурай і спортам. У палажэнні ўведзены патрабаванні да тыднёвага рухомага рэжыму. Іх выкананне — залог паспяховай здачы нарматываў комплексу ГПА.

У. МАКАРЭВІЧ,
загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.

# ВУЧЫСЯ КІРАВАЦЬ САБОЙ

*(Працяг. Пачатак у № 14 за 18 красавіка г. г.).*

Для іншых практыкаванняў аутагеннай трэніроўкі існуюць вызначаныя позы, найбольш зручныя для расслаблення мышц.

Працамі В. М. Бехцерава і іншых вучоных даказана, што самаўнушэнні лепш рэалізуюцца, калі мышцы максімальна расслаблены. Звычайна гэта бывае ў час засынання і ў перыяд, які непасрэдна наступае за абуджэннем. Таму лепшы час для заняткаў — ранак і вечар. Для расслаблення мышц прымяняецца рад палажэнняў.

Найбольш распаўсюджаныя палажэнні для гэтых заняткаў:

**Палажэнне лежачы.**

Прымаецца зручная, свабодная поза на спіне, галава ляжыць на падушцы, рукі выцягнуты паўз тулава, далонямі ўніз і злёгку сагнуты ў локцях. Ногі выцягнуты, расслаблены, наскі ступняў звернуты наружу.

**Палажэнне седзячы.**

Неабходна сесці на стул і нахіліць тулава трохі ўперад, крыху сагнуць спіну і апусціць галаву на грудзі. Ногі расстаўлены і знаходзяцца пад прамым вуглом адна да другой. Прадплечны ляжаць на іх без упору, кісці рук свабодна звісаюць, мышцы максімальна расслаблены — поза нагадвае стан «кучара на дрожках», які змарыўся.

**Палажэнне паўлежачы.**

Седзячы ў крэсле з высокімі падлакотнікамі і падгалоўнікам, зручна адкінуцца на спінку, закрыць вочы, ногі па магчымасці выпраміць і некалькі развесці ў бакі. Рукі свабодна ляжыць на каленях ці падлакотніках.

**Палажэнне лежачы на баку.**

Дазваляецца ляжаць на любым (правым ці левым) баку. Рука з таго боку, на якой ляжыць той, хто трэніруецца, знаходзіцца далонню пад галавой. Другая рука ляжыць ля тулава ці выцягнута ўперад.

Такім чынам, для аутагеннай трэніроўкі прымаем палажэнне, закрываем вочы, устанаўліваем роўны і спакойны рытм дыхання, вымаўляючы славесную «формулу дыхання»: «Я спакойны... Я зусім спакойны...» Пасля 2 —3 мінут спакойнага дыхання ў думках вымаўляем славесную формулу супакаення, расслаблення, адключэння ад акружаючага. Паўтараем яе ўдумліва, не спяшаючыся. Неабходна адчуць змест вымаўляемых слоў, ярка уявіць той стан, які імі абазначаецца. Пасля кожнай фразы наступае невялікая пауза (5 — 7 секунд), у час якой робім адзін удых і выдых (адзін дыхальны цыкл). Калі ўстановіцца роўнае і раўнамернае дыханне, вымаўляем формулу «адпачынку, спакою і расслаблення».




**Формула «адпачынку, спакою і расслаблення»**

«Я спакойны... Я зусім спакойны... Я адпачываю... Адпачывае ўсё маё цела...

Цела прыемна расслаблена і адпачывае...

Адпачывае кожная клетачка майго арганізма...

Адпачывае кожны мускул...

Адпачывае кожны нерв...

Мышцы прыемна прасслаблены...

Мышцы твару вялыя і спакойныя...

Расслаблены і спакойны мышцы ілба... броваў... вачэй... носа... шчок... губ... рота... (пры гэтым у думках прасачыце за мышцамі твару, і вы заўважыце, як гэтыя мышцы сапраўды пачнуць расслабляцца, а ніжняя чэлюсць злёгку адвісне і язык акажацца ля краю ніжніх зубоў).

Я спакойны... Я зусім спакойны...

Я адпачываю...

Пабочныя гукі перасталі мяне хваляваць...

Перасталі турбаваць...

Я ўважлівы і сканцэнтраваны на вымаўляемых словах...».

Для асваення гэтага практыкавання патрэбен час (1 — 2 тыдні)— у залежнасці ад вашых уласных псіхалагічных асаблівасцей. Але пакуль вы свабодна і лёгка не навучыцеся выклікаць стан спакою і адпачынку, пераходзіць да засваення наступнага практыкавання нельга.

Прычым славесныя формулы дазваляецца мяняць па ўгледжанню, прытрымліваючыся агульнага правіла іх вымаўлення. Фразы вымаўляюцца ад першай асобы адзіночнага ліку цяперашняга часу загадным тонам, без часціцы «не», кожная фраза паўтараецца некалькі разоў, удумліва і не спяшаючыся.

Г. МАЗО,
урач-псіхатэрапеўт.

*(Працяг будзе).*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

25 красавіка 1985 г.
Зак. 2428. АТ 13307.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ